# Наступствы Другой сусветнай вайны

**План урока** **45 хвілін** **Узрост: 13-16 гадоў**

## Матэрыялы для выкарыстання на занятку:

- фатаграфіі горада Познань, зробленыя ў розны час;
- класіфікаваныя аб’явы, размешчаныя ў газетах і ў іншых месцах у пасляваенныя гады.

## У гэтым занятку мы разгледзім наступствы Другой сусветнай вайны праз:

- аналіз фатаграфій;
- мазгавы штурм (брэйнстормінг);
- аналіз класіфікаваных аб’яў (навучэнцы выказваюць свае каментарыі).

# Уступ

Ніжэй прыведзены набор фотаздымкаў Познані, датаваных 1942, 1945, 1948 і 1955 гадамі. Размясціце фатаграфіі ў храналагічным парадку і растлумачце свой выбар.

## 1

Крыніца: https://cyryl.poznan.pl/kolekcja/stary-rynek-pierzeja-wschodnia-mkz/




## 2

Крыніца: https://cyryl.poznan.pl/kolekcja/stary-rynek-pierzeja-wschodnia-mkz/



## 3

Крыніца: https://cyryl.poznan.pl/kolekcja/stary-rynek-pierzeja-wschodnia-mkz/



## 4

Крыніца: https://cyryl.poznan.pl/kolekcja/stary-rynek-pierzeja-wschodnia-mkz/



Якая пара фотаздымкаў, па вашым меркаванні, лепш за ўсё ілюструе:

а Наступствы Другой сусветнай вайны;
б працэс пасляваеннага аднаўлення;
в пераемнасць у горадзе (па жаданні);
г пасляваенныя змены (па жаданні).

Растлумачце свой выбар.

Абярыце сцвярджэнні, з якімі вы згодныя:

а Гэтыя фатаграфіі адлюстроўваюць змены межаў пасля Другой сусветнай вайны.
б Гэтыя фатаграфіі адлюстроўваюць міграцыю пасля Другой сусветнай вайны.
в Гэтыя фатаграфіі адлюстроўваюць мясцовыя наступствы глабальнай палітыкі.
г Гэтыя фатаграфіі адлюстроўваюць універсальны/агульначалавечы вопыт у пасляваеннай Еўропе.

Растлумачце свой выбар.

# Асноўная частка

### Мазгавы штурм

Якія наступствы вайны адчулі на сабе людзі ў 1940-х, 1950-х і 1960-х гадах? Запішыце свае ідэі. Паспрабуйце прааналізаваць не толькі насельніцтва вялікіх разбураных гарадоў, але і невялікіх, якія не падвяргаліся бамбардзіроўкам, а таксама вясковае насельніцтва.

### Выбірайце

Вылучыце класіфікаваныя аб'явы (прадстаўленыя ніжэй), якія адлюстроўваюць наступствы Другой сусветнай вайны. Патлумачце, якія менавіта наступствы адлюстраваныя ў канкрэтнай аб'яве. Каментар для настаўнікаў: Праца ў групах або індывідуальна. Кожны навучэнец, пара або больш вялікая група навучэнцаў працуе з канкрэтнай аб'явай або групай аб'яў.

### Растлумачце

Якім чынам асобы, якія размясцілі пэўныя аб'явы, стараліся пераадолець тыя ваенныя наступствы, што былі адлюстраваныя ў іх аб'явах (пры наяўнасці).

## Аб'явы

«Узнагарода ў памеры 100 тыс. злотых за знойдзенае дзіця. Шукаю 8-гадовую Ірэну Слівіньскую (Ірэну-Гізэлу Рэгестрэйф), 31 ліпеня 1938 года нараджэння, са Львова. Светлыя валасы, блакітныя вочы, меркавана была пакінутая без нагляду Сюзаннай Вайнаровіч паблізу Галіцкай плошчы і вуліцы Баторыя ў Львове ў першай палове чэрвеня 1943 года. Любую інфармацыю накіроўваць у Бюро аб'яў і рэкламы Польскага агенцтва друку, Варшава, вул. Перацкага, 11, з пазнакай «сто тысяч»». «Польскае Слова» (Уроцлаў), 6 лістапада 1946 г.

Nagroda 100 tysięcy złotych za odnalezienie dziecka. Poszukuje się ośmioletniej Ireny Śliwińskiej (Irena-Gizela Regenstreif) ur. 31 lipca 1938 r. we Lwowie. Blondynka, oczy niebieskie, pozostawione bez opieki przez Zuzannę Wojnarowicz, podobno w okolicach pl. Halickiego i ul. Batorego we Lwowie w pierwszej połowie czerwca 1943 r. Wszelkie informacje należy nadsyłać do Biura Ogłoszeń i Reklamy PAP. Warszawa, ul. Pierackiego 11 pod “sto tysięcy” - SP, 6 XI 1946, w: Ligarski, w: Kucharski, s. 31

«Знікла дзяўчынка нямецкай нацыянальнасці, Разіта Хэфер, 3 гады, светлыя валасы, у сінім паліто. Просьба праводзіць яе ў лагер для немцаў, вул. Міцкевіча, паверх 3, Чырвоны Крыж». «Кур'ер Шчэціньскі», 5 красавіка 1946 г.

Zaginęło dziecko narodowości niemieckiej Razita Hoeffer, lat 3, blondynka w niebieskim paltku. Odprowadzić, Obóz dla Niemców. Mickiewicza. Etap 3. Czerwony Krzyż. “ Kurier Szczeciński, 5 IV 1946, Ligarski, w: Kucharski, s. 31

«Вазьму на выхаванне сімпатычнага маленькага хлопчыка. З узнагародай». «Кур'ер Шчэціньскі», 13 жніўня 1948 г.

Ładnego chłopczyka przyjmę wychować, wynagrodzę, Kurier Szczeciński z 13 VIII 1948, Ligarski, w: Kucharski, s. 29

«Аддам двухмесячнага хлопчыка ў добрыя рукі на выхаванне або для магчымага ўсынаўлення. “Польскае Слова” з пазнакай “Чэслаў”», «Польскае Слова», 15 сакавіка 1948 г.

Oddam dwumiesięcznego chłopczyka w dobre ręce na wychowanie, ewentualnie za swego. “Słowo Polskie” pod “Czesław”, SP, z 15 III 1948, Ligarski, w: Kucharski, s. 28

«Зеліньскага Рычарда, які нядаўна пражываў ва Львове, шукае жонка Зеліньска Мечыслава, Главацкага, 15/1, Уроцлаў, па справе аб разводзе». «Польскае Слова», 22 мая 1956 г.

Zielińskiego Ryszarda ostatnio zamieszkałego we Lwowie poszukuje żona Zielińska Mieczysława, Wrocław Głowackiego 15/1, Sprawa rozwodowa (Słowo Polskie, 22 V 1956., K. Targosz)

«Рэпатрыянтка, канторская служачая па прафесіі, мілая і сімпатычная на меркаванне іншых, 22 гады, рамантычная, рэлігійная, усталюе сацыяльны кантакт з джэнтльменам да 30-ці гадоў, пажадана служачым, інтэлігентным, са стабільным становішчам. Вайскоўцы вітаюцца». Працытавана С. Лігарскім у Randki retro. Poznam panią nieszczupłą, «Polityka», 2013, нумар 37 (2924), стр. 58-59.

Repatriantka, z zawodu pracowniczka biurowa podobno miła i sympatyczna, lat 22, romantyczka, religijna, nawiąże kontakt towarzyski z panem w wieku do lat 30, najchętniej urzędnikiem, inteligentnym, statecznym. Wojskowi mile widziani, S. Ligarski, Randki retro. Poznam panią nieszczupłą, “Polityka”, 2013, nr 37 (2924), s. 58-59.

Абвесткі ў газеце «Фольксцайтунг» (Volkszeitung), галасы Камуністычнай партыі Германіі, зямля Саксонія[1]



Arbeiterinnen
für die Entlausungsanlage der Stadt Dresden sofort gesucht. Persönliche Meldungen mit Arbeitszeugnissen werktags zwischen 10 bis 15 Uhr in Dresden, Altonaer Straße 15.

**«Жанчыны-работніцы**
патрабуюцца ў т э р м і н о в ы м п а р а д к у на дэзынсекцыённую ўстанову горада Дрэздэна. Заявы з рэкамендацыямі прымаюцца па працоўных днях з 10:00 да 15:00 па адрасе: 15 Altonaer Street, Дрэздэн».
*Дата абвесткі: 20 ці 21.09.1945 г.*



Interimstheater Dresdner Bühnen
sucht zu kaufen:
Theaterkostüme, Stoffe für Theaterzwecke, Bühnenschuhe u. ä.
Angebote an Interimstheater Dresdner Bühnen, Dresden A 1, Opernhaus, erbet.

**«Часовы тэатр Дрэздэнскай сцэны**
купіць: Тэатральныя касцюмы, тканіну для тэатральных мэтаў, тэатральны абутак і інш.
Прапановы накіроўваць Часоваму тэатру Дрэздэнскай сцэны, Дрэздэн А1, Оперны тэатр».
*Дата абвесткі: 06.09.1945 г.*



Neues Dresdner Revue- und Varieté - Theater
Dresden N 23, Heidestraße 4
Festsaal Göhle-Werk
„Das Theater der Tausend“
Täglich 18.30 Uhr
sonnabends und sonntags auch 15 Uhr
nur noch kurze Zeit
der große Erfolg
„Revue des Lebens“
mit den Varietéfestspielen 1945

**«Новы тэатр рэвю і вар’етэ “Тэатр Тысячы”**
Адрас: Дрэздэн № 23, Хайдэ Штр. 4,
Банкетная зала Göhle-Werk
Штодня ў 18:30
Таксама па суботах і нядзелях у 15:00
Хутка *завяршыцца!*
Ашаламляльны поспех
**“Рэвю жыцця”**
у межах Фестывалю вар’етэ 1945».
*Дата абвесткі: 06.09.1945 г.*



Georg Wörtge, Bühnenlehrer
Ausbildung zur Operette
Sprachreinigung — Vortrag
Rollenstudium
Anmeldung für Oktober
Dresden A 20 Lockwitzer Str. 3,1

**«Георг Вёртге, выкладчык сцэнічных дысцыплін**
Падрыхтоўка па кірунку “аперэта”
Вакальная падрыхтоўка
Падрыхтоўка ролі
Запіс на заняткі ў кастрычніку па адрасе:
Дрэздэн А20, Lockwitzer 3,1».
*Дата абвесткі: 21.08.1945 г.*



Konzentrationslager
AUSCHWITZ
Meine Frau Erna Agunte, geb. 6. 7. 1894, soll angeblich am 4. 1. 1945 im Konzentrationslager Auschwitz verstorben sein. Ehemalige Insassen des Konzentrationslagers Auschwitz, die meine Frau gesehen oder gesprochen haben, werden um nähere Mitteilung gebeten.
Gust. Agunte, Kapellmeister, Dresden N 23, Rahnstr. 26 (frühere Stranskystraße).

**“Канцэнтрацыйны лагер АЎШВІЦ**
Мая жонка Эрна Агунтэ, 6 ліпеня 1894 года наражэння, як мяркуецца, загінула 4 студзеня 1945 года ў канцэнтрацыйным лагеры Аўшвіц. Запрошваецца інфармацыя ад былых зняволеных канцэнтрацыйнага лагера Аўшвіц, якія маглі бачыць маю жонку ці размаўляць з ёй.
Густ. Агунтэ, дырыжор, Дрэздэн N23, Rahn Street 26 (былая Stransky)”.
*Дата абвесткі: 25.08.1945 г.*

[1] На падставе дазволу, ласкава прадастаўленага Андрэасам Шварцэ, theaterarchiv-dresden.de.


Wer repariert Flügel?
(Ersatzteile nötig). Ang. an Dresdner Operetten-Theater, Dresden A 46.

«**Хто рамантуе канцэртныя раялі?** (патрэбныя запчасткі)
Прапановы накіроўваць Дрэздэнскаму тэатру аперэты, Дрэздэн А45».
*Дата абвесткі: 28.08.1945 г.*


STAATSKAPELLMEISTER
KURT STRIEGLER
beginnt ab sofort
Unterrichtskurse
Opernpartienstudium
Ensemblekunst
Dirigentenbildung
Komposition
Künstlerische Fachberatung
Persönliche Anmeldung:
Radeberger Straße 29
bei Kienert

«Дзяржаўны рэжысёр **КУРТ ШТРЫГЛЕР** абвяшчае набор на **заняткі па вывучэнні**:
Оперы
Ансамбля
Дырыжорства
Кампазіцыі
Мастацкай педагогікі
Запіс асабіста па адрасе: Radeberger Straβe 29, Kienert».
*Дата абвесткі: 14.08.1945 г.*

Аб'ява з газеты Groß-Lünen Gazette


Hausbesitzer!
Gesucht wird eine bombenbeschädigte
3-4-Zimmer-Wohnung,
die von eigenen Handwerkern mit instandgesetzt werden kann. Schriftl. Angebote unter Nr. 697 an die Geschäftsstelle.

«**Домаўладальнікі!**
Шукаем **3-4-пакаёвую кватэру**, якая была пашкоджаная ў ходзе бамбаванняў, для аднаўлення і рамонту нашымі майстрамі. Прапановы ў пісьмовай форме з указаннем нумара 697 накіроўваць у бюро».
*Дата абвесткі: 27.12.1945 г. (?)*


Ehemaliger Polizeibeamter d. R., schreibgewandt, sucht passenden
Wirkungskreis
im Büro, Lager etc. Schriftliche Angebote unter Nr. 67 an die Agentur Buchhandlung A. Weber, Lünen-Süd, Jägerstraße 45.

Suche Stelle

«Былы паліцэйскі [...], добрыя навыкі пісання, шукае прыдатную **сферу дзейнасці** (канцылярская праца, праца на складзе і г.д.). Прапановы ў пісьмовай форме з указаннем нумара 67 накіроўваць у кнігарню агенцтва па адрасе A. Weber, Lünen-Süd, Jägerstraβe 45».
*Дата абвесткі: 27.12.1945 г.*


Wer verkauft einer Flüchtlingsfrau mit zwei kl. Kindern eine kleine
Petroleum-lampe?
J. Pendzich, Lünen-Süd, Saarbrücker Straße 20.

«Уцякачка з двума маленькімі дзецьмі набудзе невялікую **газоўку**? J. Pendzich, Lünen-Süd, Saarbrücker Straβe 20».
*Дата абвесткі: 27.12.1945 г.*

Аб’явы, прыведзеныя ніжэй, узятыя з сайта klops.ru[2]:



Гр. УТКИНА Елена Ивановна, проживающая в г. Калининграде по ул. Энгельса, 47, возбуждает дело о расторжении брака с гр. УТКИНЫМ Гавриилом Васильевичем, проживающим в г. Калининграде, Организаторская, 9.
Дело подлежит рассмотрению в нарсуде 1-го участка гор. Калининграда.

«Гр. УТКІНА Алена Іванаўна, якая пражывае ў г. Калінінградзе па вул. Энгельса, 47, пачынае справу аб скасаванні шлюбу з гр. УТКІНЫМ Гаўрыілам Васільевічам, які пражывае ў г. Калінінградзе, Арганізатарская, 9.
Справа падлягае разгляду ў нарсудзе 1-га ўчастка гор. Калінінграда».



12 сентября КОНЦЕРТ
Любови ОРЛОВОЙ
лауреата Сталинской премии, народной артистки РСФСР
Концерт дается в пользу детей-сирот, родители которых погибли во время Великой Отечественной войны.
Билеты продаются.
Концерт состоится в клубе по ул. Бетховена
Начало—в 21 час

“12 верасня КАНЦЭРТ
**Любові АРЛОВАЙ**
**лаўрэата Сталінскай прэміі**, народнай артысткі РСФСР
Канцэрт даецца на карысць дзяцей-сірот, бацькі якіх загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.
**Квіткі прадаюцца.**
Канцэрт адбудзецца ў клубе па вул. Бетховена.
Пачатак – а 21-й гадзіне».



Калининградскому Трамвайному тресту срочно требуются рабочие, ИТР и служащие следующих специальностей:
*бухгалтеры, инженеры и техники строители, инженеры-механики, инженеры-электрики, инженеры-путейцы, слесари, шоферы, автослесари, токари, электромонтеры, электрослесари, столяры, плотники, каменщики, маляры, кондукторы, вагоновожатые, газосварщики, электросварщики, кузнецы, мастера-путейцы, рабочие по путям, диспетчеры, нарядчики, кладовщики, десятники, кассиры, табельщики, нормировщики, билетные контролеры, вахтеры, разнорабочие, секретарь-машинистка, рабочие подсобного х-ва.*
Поступающим на работу предоставляется жилплощадь, выплачиваются подъемные; зарплата по соглашению.
Обращаться по адресу: ул. Огарева, № 31 (бывшая Оттокарштрассе) отдел кадров Трамвайного треста.

«**Калінінградскаму Трамвайнаму трэсту тэрмінова патрабуюцца рабочыя, ІТР і служачыя наступных спецыяльнасцей:**
*бухгалтары, інжынеры і тэхнікі-будаўнікі, інжынеры-механікі, інжынеры-электрыкі, інжынеры-пуцейцы, слесары, шафёры, аўтаслесары, токары, электраманцёры, электраслесары, сталяры, цесляры, муляры, маляры, кандуктары, вагонаважатыя, газазваршчыкі, электразваршчыкі, кавалі, майстры-пуцейцы, рабочыя па шляхах, дыспетчары, нарадчыкі, кладаўшчыкі, дзясятнікі, касіры, табельшчыкі, нарміроўшчыкі, білетныя кантралёры, вахцёры, рознарабочыя, сакратар-машыністка, рабочыя падсобнай гаспадаркі.*
Тым, хто ўладкоўваецца на працу, прадастаўляецца жылплошча, выплачваюцца пад’ёмныя; зарплата па пагадненні.
Звяртацца па адрасе:
вул. Агарава, № 31 (былая Отакарштрасэ) аддзел кадраў Трамвайнага трэста».

[2] https://klops.ru/news/2018-06-19/176532-iz-istorii-goroda-k-pochemu-kaliningrad-ne-stal-baltiyskom-i-v-chest-kogo-nazvana-ulitsa-vagnera

## Вынікі

Перачытайце свой пералік наступстваў Другой сусветнай вайны. Якія новыя аспекты вы б дадалі?

## Хатняе заданне

«У кожнага быў свой уласны, індывідуальны вопыт; тым не менш Другая сусветная вайна стала вайной, наступстваў якой не пазбег ніводны еўрапеец». Прааналізуйце гэтае сцвярджэнне ў форме аргументатыўнага эсэ, выкарыстоўваючы доказы з дадзенага занятку і з іншых крыніц.

## Інфармацыя для настаўнікаў

### Уступ

Уступ дазволіць навучэнцам задумацца пра наступствы вайны, "пагрузіцца" ў нейкай ступені ў пасляваенныя рэаліі, прадстаўленыя на фотаздымках, а таксама зверне іх увагу на праблемы пасляваеннага аднаўлення і падрыхтуе іх да мазгавога штурму ў пачатку Асноўнай часткі занятку. Акрамя гэтага, такі падыход дазволіць навучэнцам правесці шматаспектны аналіз фотаздымкаў не толькі як «аб'ектыўных» дакументаў рэальнасці ў пэўнай часавай кропцы і ў пэўным месцы, але і як свайго роду носьбітаў аргументаў і пэўных пасланняў, інструментаў для выпрацоўкі пэўных ідэй.
Адказы на мноства выяў: 1) 1942 2) 1945 3) 1948 4) 1955

### Асноўная частка

У ходзе мазгавога штурму навучэнцы свабодна выказваюць свае ідэі, кожная з якіх павінна быць прынятая да ўвагі для далейшага разгляду. Адказы не дзеляцца на «правільныя» і «няправільныя». Выкладчык адзначае ідэі па меры іх паступлення (без каментарыяў, без адбору, без ацэнкі), пажадана на дошцы, каб было бачна ўсім. Ідэі можна развіваць, але не паўтараць.

Для сесіі мазгавога штурму павінна быць устаноўленае агульнае абмежаванне па часе.

У першай частцы сесіі кожнага навучэнца просяць прапанаваць адну ідэю; для гэтай часткі прадугледжанае абмежаванне па часе. На гэтым этапе не даюць тлумачэнняў; ідэі проста запісваюць на дошцы/схеме. Гэтая частка заканчваецца, калі не будзе новых ідэй, ці па заканчэнні ўстаноўленага часу.

У наступнай частцы сесіі навучэнцы могуць папрасіць патлумачыць любую з ідэй; для гэтай часткі таксама прадугледжанае абмежаванне па часе. Ідэі тлумачаць па чарзе, пры гэтым таму, хто прапанаваў ідэю, прадстаўляецца невялікі абмежаваны час, на працягу якога ён/яна павінны даць тлумачэнне.

Пасля таго як будуць дадзеныя тлумачэнні па ўсіх прапановах, якія іх патрабавалі, навучэнцы могуць прагаласаваць за лепшыя прапановы. Галасаванне можа быць рэалізаванае рознымі спосабамі: напрыклад, кожны выбірае адну прапанову і ўказвае нумар прапановы на аркушы; навучэнцы па чарзе пытаюцца, што яны выбралі, і прапановы ранжыруюць. [Гэтая частка павінна перш за ўсё садзейнічаць фармаванню ў навучэнцаў пачуцця ўцягнутасці ў працэс; фармуляванне і тлумачэнне прапаноў маюць перавагу.]

**Праверка:** Агульная працягласць з улікам розных элементаў працэсу не павінна перавышаць агульную працягласць, узгодненую ў пачатку для ўсяго працэсу.

**Аб’явы: (дадатковая інфармацыя да аб’яў, пералічаная зверху)**

1 Львоў знаходзіўся пад савецкай акупацыяй з 1939 па 1941 год, пад нямецкай – да 1944 года, пасля чаго зноў вярнуўся пад савецкі кантроль. Дадатковае пытанне: што магло адбыцца з дзіцем?

2 Аб’ява датуецца перыядам прымусовага перасялення нямецкага насельніцтва з тэрыторыі Уроцлава (Уроцлаў стаў часткай Польшчы пасля вайны, і нямецкае насельніцтва было вывезенае адтуль).

3 Адны людзі хацелі «прыдбаць» дзяцей, каб клапаціцца пра іх, іншыя ж імкнуліся аддаць сваіх дзяцей на выхаванне або ўсынаўленне. Нярэдка ў тыя гады (як і да гэтага) дзяцей аддавалі на выхаванне далёкім сваякам (цёткам і дзядзькам), сябрам ці іншым людзям, калі ў бацькоў не было дастаткова часу або грошай для іх выхавання (ці калі ў сям’і было занадта шмат дзяцей і бацькі не маглі паклапаціцца пра ўсіх). Такія дзеці маглі толькі зрэдку наведваць сваіх бацькоў. Відавочна, што маральныя і сацыяльныя нормы змяніліся з таго часу.

4 Людзі шукалі сваіх сужэнцаў не толькі для ўз’яднання, але і для таго, каб пачаць новае жыццё, з іншымі партнёрамі, у другіх абставінах, і, такім чынам, «зачыніць дзверы ў мінулае».

5 «Рэпатрыяваны(ая)», «рэпатрыянт(ка)» – тэрміны, якія выкарыстоўваліся ў дачыненні да людзей, якія мігравалі ў Польшчу пасля Другой сусветнай вайны з даваенных польскіх тэрыторый, што сталі часткай СССР пасля вайны, а таксама з іншых частак СССР. Выдзяляюць дзве асноўныя хвалі гэтай міграцыі: у 1945—1949 і ў 1957—1959 гг.

**Абвесткі ў газеце «Фольксцайтунг» (Volkszeitung), галасы Камуністычнай партыі Германіі, зямля Саксонія**

**Георг Вёртге** (22.11.1888 – 7.12.1977) – адзін з самых папулярных артыстаў і выканаўцаў дрэздэнскіх тэатраў аперэты, якія працавалі ў жанры фальклору, з 1919 года. Калі ў студзені 1933 году распалася берлінская тэатральная трупа, якой кіравалі браты-яўрэі Ротэр і ў склад якой уваходзілі тэатры “Цэнтральны” і “Рэзідэнц” у Дрэздэне, тэатральнымі рэжысёрамі гэтых тэатраў сталі Вёртге і яго калега Сукфюль. 1 снежня 1936 года на Альбертплатц адкрыўся «Народны тэатр»; гэта быў муніцыпальны тэатр нацыянал-сацыялістычнай скіраванасці, які карыстаўся падтрымкай “Германскага працоўнага фронту” і Міністэрства асветы і прапаганды Рэйха. Вёртге ўзначаліў аперэту. Ён таксама ўступіў у Нацыянал-сацыялістычную нямецкую працоўную партыю (НСДАП) 1 мая 1937 года. 15 мая 1944 года Вёртге атрымаў ліцэнзію ад Палаты тэатраў рэйху на права выкладання сцэнічных дысцыплін з тэрмінам дзеяння да 1947 года. Пасля 8 мая 1945 года ён працягнуў працаваць выкладчыкам сцэнічных дысцыплін і граць у прыватных тэатрах. Увесну 1946 года мінулае дагнала яго, і ён быў падвергнуты допытам. Зрэшты, можна сказаць, што актору, які, верагодна, лічыў сябе апалітычным чалавекам, пашанцавала. Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі (САПГ), зацікаўленай у дэмакратычным абліччы, патрабаваліся такія папулярныя артысты, як Вёртге, для заваявання сімпатый у прадстаўнікоў розных сацыяльных груп. Георг Вёртге змог працягнуць сваю кар’еру ў 1947 годзе, спачатку – у Народным тэатры (Volksbühne), а пазней – у Дрэздэнскай дзяржаўнай аперэце да 1973 года.

**Густаў Агунтэ** (1900—1976) – музыка, які атрымаў вядомасць у 1924 годзе і стаў пасля дырыжорам аркестра Сярэдненямецкага радыёвяшчання Лейпцыга АГ» (Mitteldeutsche Rundfunk AG Leipzig/MIRAG), пераўтворанага нацыстамі ў 1934 годзе ў Імперскае радыё Лейпцыга (Reichssender Leipzig). Яго жонка-яўрэйка Эрна была дэпартаваная ў канцлагер, і яе лёс так і застаўся невядомым. Іх дачка Анэлізэ была танцоўшчыцай Дрэздэнскай дзяржаўнай оперы да 1933 г., калі ёй забаранілі працаваць, бо яна была напалову яўрэйкай. Пасля 8 мая 1945 года яна займала пасаду балетмайстра ў розных тэатрах Дрэздэна. Густаў і яго сын Рольф-Гюнтэр Агунтэ заснавалі Вялікі аркестр Дрэздэнскага радыё і Эстрадны аркестр Дрэздэнскага радыё ў 1945 годзе.

**Курт Штрыглер** (7.1.1886, Дрэздэн – 4.8.1958, Вільдтурн/Ландау) актыўна ўдзельнічаў у музычным жыцці Дрэздэна як выкладчык, дырыжор, музыка і кампазітар. У 1912 годзе ён стаў дырыжорам Дрэздэнскай прыдворнай (дзяржаўнай) оперы.

7 сакавіка 1933 года нацысцкія падбухторшчыкі ў форме сарвалі пачатак оперы «Рыгалета» ў Дзяржаўнай оперы. Дырыжорам пастаноўкі быў галоўны дырыжор Фрыц Буш – касмапаліт, які лаяльна ставіўся да артыстаў яўрэйскага паходжання. Буша выгналі з будынка. Пад рукой аказаўся дырыжор Курт Штрыглер, які і прыняў на сябе дырыжыраванне operaй: кіраўніцтва спектаклем. Штрыглер затым уступіў у НСДАП і стаў дзяржаўным дырыжорам і дырэктарам дрэздэнскай кансерваторыі.

Пасля канца вайны ў маі 1945 года ён працягнуў працаваць у Дрэздэне, які быў моцна разбураны бамбардзіроўкамі саюзнікаў у лютым 1945 года. Тым не менш, так як ён быў членам НСДАП, ён пераехаў з ГДР (Усходняя Германія, дзе пасля вайны праводзілася актыўная “дэнацыфікацыя”) у Мюнхен (ФРГ) у 1950 годзе. Курт Штрыглер памёр у 1958 годзе ў Баварыі, але знайшоў месца апошняга супакаення на старых каталіцкіх могілках у сваім родным горадзе Дрэздэне.

## Вынікі

У залежнасці ад вынікаў мазгавога штурму ў пачатку занятку і новых ідэй навучэнцаў.

## Хатняе заданне

Вы можаце выкарыстаць схему, распрацаваную Чонсі Монтэ-Сана з Мічыганскага ўніверсітэта; схема прыведзеная ніжэй.

1 Вызначыце, што вы лічыце важным; гэта будзе вашым тэзісам (або пазіцыяй).
2 Абгрунтуйце ваш тэзіс. Чаму вы маеце рацыю?

   а Падайце доказы (інфармацыю з крыніц(ы), якая пацвярджае ваш тэзіс).
   б Растлумачце, як доказы пацвярджаюць ваш тэзіс.
   в Растлумачце, чаму вашы доказы заслугоўваюць даверу.

3 Падвядзіце вынікі вашых разважанняў.

**Альтэрнатыўная методыка і дадатковыя матэрыялы.** Мэта занятку – абмеркаваць, ці павінны наступствы вайны быць увекавечаныя або яны павінны быць пераадоленыя (напрыклад, ці варта руіны, такія як руіны Фраўэнкірхе (царквы Багародзіцы) у Дрэздэне, захаваць у выглядзе руін, рэканструяваць будынак або знесці руіны для ачысткі тэрыторыі).

1 Навучэнцам выдаюць наборы аб’яў; задача навучэнцаў – выбраць аб’явы, якія паказваюць, што людзі хочуць вярнуцца да нармальнага жыцця, пераадолець наступствы вайны.

2 Гісторыя дрэздэнскай Фраўэнкірхе (царквы Багародзіцы) з «Вікіпедыі»: https://bit.ly/3peU5Kt

   Было б добра азнаёміцца з версіямі на розных мовах. У прыватнасці, кірылічную версію (на рускай мове) варта зверыць з версіямі на англійскай, нямецкай мовах, так як апошнія версіі змяшчаюць значна больш інфармацыі. Нагадваем вам, што артыкулы ў “Вікіпедыі” могуць рэдагавацца ў любы момант. Навучэнцам варта нагадваць пра гэты факт; змест артыкулаў неабходна рэгулярна правяраць.

3 Заключнае эсэ: ці павінны мы ўвекавечваць памяць і наступствы Другой сусветнай вайны або мы павінны імкнуцца да іх пераадолення? Які варыянт вы б падтрымалі: рэканструкцыю Фраўэнкірхе ў Дрэздэне або захаванне яе руін? Растлумачце свой выбар.